# САКРАЛЬНАЕ ЗНАЧЭННЕ РЫТУАЛУ КАЛЯДНАЙ ВЯЧЭРЫ

*Д.А.Шчатко (Мінск, МДЛУ)*

Статья посвящена теме Рождества. Праздник зимнего солнцестояния, изначально языческий, после принятия христианства приобрел новый смысл и отмечается сегодня. Многие элементы Рождества видоизменились, утратили то значение, которое было придано им в древности. Одним из главных элементов праздника является рождественский ужин. На основе материалов авторитетных фольклористов и этнографов автор статьи исследовала обряды праздничного рождественского обеда белорусов и других народов. Автор проанализировала функции ритуальных действий, выявила различия и сходства, подчеркнула единство представлений разных народов о сакральности рождественского обеда.

Ключевые слова: обряд; рождественский обед; кутья; ритуал; сакральность; магические функции.

# THE SACRED SIGNIFICANCE OF THE RITUAL OF THE CHRISTMAS DINNER

*D.A.Shchatko (Minsk, MSLU)*

The article is devoted to the theme of Christmas. The winter solstice holiday, originally pagan, took on a new meaning after the adoption of Christianity and is celebrated today. Many elements of Christmas have changed and lost the meaning that was given to them in ancient times. One of the main elements of the holiday is Christmas dinner. Based on materials from authoritative folklorists and ethnographers, the author of the article examined the rituals of the festive Christmas dinner of Belarusians and other peoples. The author analyzed the functions of ritual actions, identified differences and similarities, and emphasized the unity of ideas of different peoples about the sacredness of the Christmas dinner.

Key words: rite, Christmas dinner, kutia, ritual, sacredness, magical functions.

Святочная калядная вячэра – куцця – уяўляла сабой паслядоўнасць рытуалаў, якія адпавядалі хрысціянскім або язычніцкім традыцыям. Кожная рэч і кожнае дзеянне мелі сваё значэнне. Асаблівай магічнай функцыяй, якая будавалася на фармальных законах падабенства і кантакту (імітатыўная і кантактная магія) надзяляліся жалеза і сена. На Беларусі было прынята абвязваць стол ланцугом, каб жывёла не пераскоквала плятнёў і не таптала пасевы. Гаспадыня абвязвала стол цэпам, які потым зачыняла на замок, каб на ўвесь год "закрыць языкі" нядобразычліўцам [5, с.182]. Усходнія германцы клалі пад стол лямеш ад плуга або частку ярма. Жыхары Букавіны (гістарычная вобласць на мяжы Ўкраіны і Румыніі) ставілі касу за лаву, каб "мерцвякі не прыйшлі, паколькі мёртвы баіцца жалеза". Дзеці білі нагамі па жалезных рэчах пад сталом – "каб ногі былі цвёрдыя, як жалеза" [4, с.9]. Сена (на Беларусі) або салому (ва Ўкраіне і ў Малдове) рассцілалі пад абрус. Балгары рассцілалі салому пад маленькі круглы столік *софра* [2, с.27 – 274]. Немцы накрывалі стол хусткай, з якой сеялі мінулым летам: многа ў ёй было зерня – многа будзе поспеху ў наступным годзе [2, с.157].

Галоўным элементам калядная вячэры была куцця – каша з ячных або іншых круп. На ўсе тры калядныя вячэры гэтую страву гатаваў хтосьці адзін

(гаспадыня ці іншая жанчына па яе даручэнні), у адным і тым жа гаршчку і з адной і той жа колькасці круп, не перамешваючы яе ў час варкі і не каштуючы да вячэры. Усё гэта павінна было забяспечваць адзінства сям'і. «Зерне валодае ўласцівасцямі надоўга захоўваць і зноў аднаўляць жыццё, памнажаючы яго. Семя – расліна – семя складаюць вядомы кругаварот, які сведчыць аб бясконцым жыцці», – тлумачыў важнае значэнне куцці філолаг і фальклярыст У.Я. Проп [6, с.19 — 20].

На куццю за сталом сабіраліся ўсе члены сям'і. Вячэра пачыналася з малітвы. На Беларусі існаваў звычай, згодна з якім гаспадар, атаясамляючыся з Богам, перад пачаткам вячэры з гаршчком куцці ў руках тройчы абыходзіў хату звонку і грукаў у акно са словамі: "*Сам Бог стукае з цёплай, мокрай вясною, гарачым небурлівым летам, з сухою і багатаю восенню*". [6, с.21 — 22]. Кожны павінен быў пакаштаваць усіх страў, якія падаваліся на стол у адпаведным парадку. Куццю, звычайна, елі апошняй [3, с.7]. Паколькі куцця была абавязковай ежай і ў памінальных абрадах, існуе сувязь калядных свят з культам продкаў [3, с.7]. Куццю падносілі памерлым сваякам з мэтай паказаць павагу да іх [6, с.352]. Французы гатавалі для памерлых спецыяльныя стравы з фасолі, морквы, пакідалі іх на стале ў асветленым пакоі, куды вярталіся ўжо пасля царкоўнай службы [2, с.38]. Рэшткі куцці і астатніх страў і сена з-пад абруса аддавалі хатняй жывёле, каб яна была здаровай і пладавітай [6, с.118].

Асобы аўтаномны рытуал (мікраабрад) у саставе складанай абраднасці святочнай каляднай вячэры – рытуальны акт запрашэння на куццю стыхій (марозу, ветру і г.д.), звяроў і птушак, памерлых, які, як зазначае С. М. Талстая, быў распаўсюджаны ва ўсходняй Беларусі, на беларускім і ўкраінскім Палессі, у Паўднёвай Польшчы, у зоне Карпат, паўднёва-ўсходняй Балгарыі, Македоніі [7, с.445]. Рытуал выражаўся ў славеснай формуле ("*Мароз, мароз, ідзі куццю есці, а летам не бывай, па межах не хадзі, яры не губі*!" [6, с.80]) і дзеяннях: вынасе ежы на вуліцу ці ў сенцы, паднясенні да акна або дзвярэй, праліванні ежы на стале.

Такім чынам, сакральнае значэнне рытуалу каляднай вячэры заключалася ў магічных функцыях асобных прадметаў, якія павінны былі выконваць наступныя задачы:

— забяспечваць адзінства сям'і;
— узмацняць здароўе жыхароў дома і хатняй жывёлы;
— ахоўваць ад нячыстай сілы і нядобразычліўцаў;
— спрыяць збору добрага ўраджаю ў наступным годзе.

Калядная вячэра з яе памінальным характарам была накіравана на ўстанаўленне кантакту жывых са светам памерлых продкаў з мэтай падтрымання касмічнай раўнавагі, каляндарнага парадку і асабістага дабрабыту.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Котович, О. Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2011. – 592 с.

2. Кожолянко, А. Г. Магически-анимистический характер рождественских календарных обрядов русинов Буковины XIX – начала XX в / А. Г. Кожолянко // Русин. – 2013. – № 3. – С.119 – 137.

3. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы :сб. тр. / Институт этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая ; редкол. С. А. Токарев (отв. ред.). – М. : Наука, 1973. – 351 с.

4. Ліцьвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў : вуч. выд / В. Д. Ліцьвінка. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 1998. – 190 с.

5. Коваль, У. І. Беларускія народныя святы і звычаі / У.І. Коваль, А.С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 1993. – 89 с.

6. Толстая, С. М. Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М. : Индрик, 2005. – 600 с.